# *ЗАМЕНА ПА СУМЕЖНАСЦІ*



**13 лістапада 2025 года ў створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школе адбыўся чарговы занятак. Яго тэма: «Сродкі мастацкай выразнасці. Метанімія».**

Удзел у грамадска-адукацыйным літаратурным праекце змаглі ўзяць прадстаўнікі розных пакаленняў. Аматары мастацкага слова сумеснымі намаганнямі пастараліся раскрыць вельмі складаную тэму. Пасля таго, як слухачы атрымалі неабходны тэарэтычны інструментар, прадставілася магчымасць на практыцы пазнаёміцца з такім мастацкім тропам, як метанімія. Пры дапамозе спецыяльных практыкаванняў мы разабраліся з тым, якія бываюць віды метаніміі па значэнні, і якія функцыі, асаблівасці ў кожнага з іх.

Самым складаным аказалася навучыцца адрозніваць метанімію ад іншых мастацкіх тропаў, напрыклад, ад метафары, сінекдахі і перыфразу.



Было агучана назіранне: метанімію часта выкарыстоўваюць у размоўным стылі (не менш, а магчыма, нават часцей, чым у літаратурным тэксце). Яшчэ высновa: да вядомай лічбавай платформы Мета (на ёй базіруюцца сацыяльныя сеткі Facebook і Instagram) паняцце дачынення не мае.

Нягледзячы на невялікую колькасць удзельнікаў занятку, атмасфера ў пісьменніцкім офісе была вельмі прыязнай і пазітыўнай. Усе жадаючыя атрымалі магчымасць падзяліцца сваімі меркаваннямі. Мэта праекта – атрыманне каштоўных ведаў у коле аднадумцаў – была дасягнутая.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** ў створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школе адбыўся чарговы занятак. Яго тэма: «Сродкі мастацкай выразнасці. Метанімія». Офіс ГрАА СПБ, 13 лістапада 2025 года.






Ірына Аркадзьеўна Салата,
пісьменніца, педагог-філолаг са стажам
і порцыя каштоўных ведаў ад яе





Зноў на нашых занятках зацікаўленая моладзь



www.pisateli.by